# СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ № 2

## ПААН—ПРАГРАМА ДЗЕЙНАСЦІ

У апошнія гады партыйныя, савецкія, камсамольскія і прафсаюзныя органы усё часцей і часцей пераходзяць ад складання бягучых (месячных, квартальных, паугадавых) планау да планау перспектыуных, разлічаных на тэрмін паўнамоцтва гэтых органау. У свой час У. І. Ленін вучыў, што «нельга працаваць, не маючы плана, разлічанага на працяглы перыяд і на сур'ёзны поспех».

І практыка пераканауча пацвердзіла, што удумлівае, стараннае перспектыунае планаванне дазваляе заглянуць у будучае і працаваць на яго, сканцэнтраваць увагу на галоуным і падпарадкаваць яму усё астатняе, своечасова, без мітусні і спешкі, рыхтаваць тыя ці іншыя мерапрыемствы, умела расставіць сілы актывістаў, павышаць адказнасць за даручаную справу кожнага і выпрацоуваць уменне улічваць фактар часу.

Члены універсітэцкай групы народнага кантролю, выбраныя у сакавіку гэтага года, задумаліся: «А што мы можам зрабіць на працягу двухгадовага тэрміну дзейнасці? Ці не скласці нам перспектыуны план работы на 1970—1972 гады?»

Пытанне аб складанні перспектыунага плана абмяркоувалася спачатку на пасяджэнні бюро групы, а пасля на агульным сходзе членау групы.

У выступленнях народных кантралёрау падкрэслівалася, што планамерная, з адчуваннем перспектывы работа не даніна модзе, а сапраўднае патрабаванне часу, навуковага кіравання грамадскімі працэсамі, што з асаблівай сілай было падкрэслена на XXIII з'ездзе КПСС.

Жыццё пастаянна патрабуе, каб у складанай, шматграннай і разнастайнай грамадскай дзейнасці, адным з праяуленняў якой з'яуляецца народны кантроль, заусёды улічваліся правільныя суадносіны агульных і прыватных, галоуных і пабочных пытанняу, каб за буднімі справамі не гублялася перспектыва, каб была магчымасць, як раіу У. І. Ленін, спакойна падумаць над работай у цэлым.

У перспектыуным плане універсітэцкай групы народнага кантролю вызначаны не толькі галоуныя напрамкі работы, але і шляхі і сродкі дасягнення той ці іншай мэты. Так, галоуныя напрамкі мы сфармулявалі наступным чынам:

дабіцца павышэння адказнасці кожнага супрацоуніка універсітэта за даручаную яму справу;

змагацца за ліквідаванне усяго таго, што перашкаджае нармальнаму ходу навучальнага працэсу і навукова-даследчай работы;

сістэматычна даводзіць да ведама калектыву універсітэта вынікі дзейнасці народных кантралёрау;

на працягу двухгадовага тэрміну пастаянна павышаць дзелавую кваліфікацыю і ідэйна-тэарэтычны узровень народных кантралёрау, выхоуваць у іх грамадзянскую мужнасць, прынцыповасць, уменне даводзіць да канца мерапрыемствы па распаусюджванню станоучага вопыту, па ліквідаванню ускрытых недахопау, агрэхау і памылак у рабоце.

Дасягненню гэтай мэты і падпарадкаваны усе мерапрыемствы, намечаныя на 1970—1972 гады.

Адпаведна зацверджанаму перспектыунаму плану мы складаем цяпер планы работы групы народнага кантролю і яе сектарау (арганізацыйна-масавай работы, заяу, скарг і удасканалення адміністрацыйна-гаспадарчага апарату; вучэбнага; навуковага; бытавога; па кантролю за ходам будаўніцтва і капітальнага рамонту будынкау; аховы сацыялістычнай маёмасці) на семестр.

У гэтых планах мы вызначаем, якія пытанні будуць прадметам уважлівага вывучэння народных кантралёрау, хто канкрэтна рыхтуе іх на абмеркаванне бюро або агульнага сходу групы, тэрміны выканання.

Мы добра разумеем, што складанне перспектыуных і бягучых планау — гэта толькі пачатак работы. Галоунае заключаецца у тым, каб ажыццявіць намечанае і дабіцца пастауленай мэты.

Думаю, што і перад факультэцкімі групамі народнага кантролю неабходна паставіць пытанне: «А ці не варта і вам падумаць аб складанні сваіх перспектыуных планау?»

Я. ТАГУНОЎ,
старшыня групы народнага кантролю БДУ.

## У ПІЛЬНЫМ ДАЗОРЫ

Група народнага кантролю філфака даволі шматлікая. У яе састау уваходзяць 29 чалавек: 10 камуністау, 14 камсамольцау, 5 беспартыйных. Узначальвае работу дацэнт кафедры рускай савецкай літаратуры В. А. Захарава.

Пасты народнага кантролю арганізаваны на кожнай кафедры і у кожнай студэнцкай групе. Гэта дазваляе прыцягваць да работы вялікае кола студэнтау і выкладчыкау, своечасова выяуляць тыя ці іншыя недахопы і садзейнічаць іх хутчэйшаму ліквідаванню.

Па ініцыятыве групы народнага кантролю сярод выкладчыкау факультэта была распаусюджана анкета «Як Вам працуецца?» Ужо цяпер на яе адказалі 62 выкладчыкі. Матэрыялы анкетнага апытання абагульняюцца. Вынікі гэтай работы дапамогуць вызначыць тыя цяжкасці, якія перашкаджаюць найбольш прадуктыунай дзейнасці выкладчыкау.

Рацыянальнай арганізацыі самастойнай работы студэнтау і выяуленню прычын, якія прыводзяць да непрадуктыунай затраты часу, садзейнічала анкетнае апытанне студэнтау III курса аддзяленняу рускай і беларускай моу і літаратуры, які быу праведзен па ініцыятыве намесніка дэкана М. М. Піпчанкі.

Народныя кантралёры не абмяжоуваюцца анкетаваннем: іх дзейнасць накіравана на рашэнне многіх будніх спрау, ліквідаванне недахопау. А такія недахопы ёсць.

У лістападзе гэтага года на пасяджэнні групы народнага кантролю разглядалася пытанне аб падрыхтоуцы вучэбнага корпуса да зімы. Кантралёры выявілі сур'ёзныя недахопы: у некаторых аудыторыях і кабінетах разбіта шкло, патрабуюць падгонкі аконныя рамы. У зімовы перыяд працяглы час даводзіцца працаваць пры штучным асвятленні, але у большасці кабінетау і аудыторый плафоны устарэлай канструкцыі, якія даюць мала святла. Тым часам на складзе ляжаць без ужывання 75 люмінесцэнтных лампау. Аднак іх абяцаюць устанавіць толькі у будучым навучальным годзе.

Ва усіх аудыторыях факультэта патрабуюць замены дошкі. Школьны мел такой дрэннай якасці, што ім амаль немагчыма пісаць. І народныя кантралёры прымаюць меры, каб ліквідаваць гэтыя недахопы.

Пасты народнага кантролю арганізавалі праверку санітарнага стану аудыторый у час заняткау. Член групы народнага кантролю А. С. Амелін правёу вялікую работу па арганізацыі строгага уліку наведвання заняткау. Народныя кантралёры праверылі работу спецсемінарау, разглядалі пытанні, звязаныя з размеркаваннем месц у інтэрнаце і назначэннем стыпендый. Сур'ёзную заклапочанасць выклікаюць у народных кантралёрау не заусёды добрасумленныя адносіны да сваіх абавязкау тэхнічных работнікау факультэта.

У апошні час дзейнасць членау ГНК прыкметна актывізавалася. Больш дзейсны удзел у рабоце групы прымаюць аспірантка З. Данільчык, выкладчыкі М. А. Пауленка, І. В. Шадурскі, Л. А. Царанкоу.

У канцы лістапада работа групы народнага кантролю разгледжана на пасяджэнні партыйнага бюро філалагічнага факультэта. Дзейнасць народных кантралёрау атрымала адабрэнне.

Б. НІКАНОВІЧ.

## ПАКУТАІВЫЯ ПАВЕРХІ

Калектыу біялагічнага факультэта вось ужо другі год працуе у светлым, прасторным новым вучэбным корпусе. Не спыняючыся на яго вартасцях, якіх, дарэчы, нямала, даводзіцца гаварыць перш за усё аб недахопах. Так, у сувязі з тым, што у паточных аудыторыях нізкая столь, чытаць і слухаць лекцыі тут даволі цяжка. Звычайна ужо праз некалькі мінут адчуваецца недахоп кіслароду. Ніякія спробы праветрыць памяшканне не даюць станоучых вынікау. Гэтыя аудыторыі патрабуюць спецыяльных вентыляцыйных установак.

Далей. Біёлагі, якія маюць справу з жывымі аб'ектамі, не могуць абысціся без вады. Аднак у лабараторыях на сёмым і восьмым паверхах вадаправодныя краны і ракавіны не устаноулены.

Пры размеркаванні плошчау новага корпуса рад кафедр атрымалі пакоі плошчай 60 і 80 кв. метрау. Для найбольш мэтазгоднага выкарыстання такія пакоі давялося часова раздзяліць шкафамі на дзве палавіны. Праводзіць паралельна заняткі у гэтых лабараторыях немагчыма. На абсталяванне гуканепрапускаемых перагародак няма дазволу.

Не падведзен у лабараторыі тэхнічны ток, таму зацягваецца увод у дзеянне раду неабходных прыборау.

Вось ужо некалькі тыдняу у корпусе не працуюць ліфты. Якія нявыгады з гэтым звязаны, кожнаму зразумела.

Хацелася б, каб рэктарат, партком, мясцком, адміністрацыйна-гаспадарчая частка універсітэта уважліва аднесліся да прыведзеных фактау і дапамаглі біялагічнаму факультэту ліквідаваць пералічаныя недахопы.

А. СЦЕФАНОВІЧ,
старшыня ГНК біяфака.

## СПЕЦКУРС ВЫНАХОДЛІВАСЦІ

*Двойчы у месяц рэгулярна у адны і тыя ж дні штурхкі, падобныя на землетрасенне, парушаюць звычайны рытм жыцця. Прыкладна а 15-й гадзіне можа знікнуць які-небудзь аддзел у поуным саставе, пакінуўшы на некалькі гадзін у адзіноце свайго начальніка, нейкая мітусня заувaжаецца у лабараторыях: заклапочаныя супрацоунікі, глядзіш, зрываюцца з месцау і выбягаюць з пакоя. Адны хутка вяртаюцца, а іншых ужо не угледзіш да канца працоунага дня.*

*На справе ж не адбываецца нічога дзіунага, проста 3 і 18 кожнага месяца усе выкладчыкі і лабаранты, інжынеры і тэхнікі, рабочыя падсобных служб праходзяць своеасаблівы спецкурс вынаходлівасці, мэта якога з найменшымі затратамі часу атрымаць зароблены грошы.*

*У ход ідзе усё: у згуртаваных калектывах у чаргу да касы пасылаецца найбольш прабіўны дэлегат, які здольны прапусціць перад сабой мінімум 10 саслужыўцау і мужна адпарыраваць падазроныя погляды, а то і больш ваяунічыя наскокі; прадбачлівыя бацькі прыводзяць з сабой дзетак рознага ўзросту і ставяць замест сябе ў чаргу, маладзенькія лабаранткі выклікаюць з дому бабулек, і тыя стаяць, пакуль хапае сіл, а бывае і бунтуюць. («Не трэба тваіх грошай, калі за імі прыходзіцца столькі стаяць!») Іншыя, менш свядомыя, але філасофскі настроеныя, разважаюць прыкладна так: у мяне сёння другая змена, пэўна, няма сэнсу ісці на работу... І вырашаюць стаяць да пераможнага канца. Чарга каля другой касы ахутана воблакам інтэлектуальных гутарак. Тут чуваць адгалоскі навуковых дыскусій і спрэчак, тут можна злавіць нялоуных апанентау і вырашыць не толькі час сустрэчы, але нават абмеркаваць усе спрэчныя пытанні.*

*Праўда, раз-пораз і тут раздаецца воклiч абурэння: «Дакуль гэта будзе працягвацца! За час, патрачаны тут, можна было б напісаць не адну дысертацыю, а артыкулау — дык і не злічыць!»*

*Наіўныя людзі! Яны і не падазраюць, як такім чынам у іх трэніруецца воля, шліфуюцца каштоуныя рысы характару, абвастраецца думка і г. д. Яны упарта прапануюць свае: адмяніць гэты спецкурс для усіх, прапанаваць яго кірауніку, галоунаму бухгалтару Э. І. Бляускаму правесці чарговыя заняткі толькі у сваім калектыве з тым, каб выпрацаваць сапрауды вынаходніцкі варыянт.*

*Б. ІГНАТОВІЧ.*




## ДНІ НАБЫЦЦЯ ВЕДАЎ

Тыя, каму давераны пачэсныя і адказныя кантралёрскія абавязкі, павінны добра ведаць тэорыю і практыку кантрольнай работы. Таму раз у два месяцы праводзяцца спецыяльныя заняткі у школе народных кантралёрау. У кастрычніку, напрыклад, яны былі прысвечаны тэме «Формы і метады забеспячэння галоснасці. Перыядычная справаздачнасць груп і іх членау перад калектывамі». Тады ж былі складзены план і тэматыка заняткау школы у гэтым навучальным годзе. У іх праграме арганізацыя кантролю за своечасовым разглядам пісьмау і скарг працоуных, службовая этыка, савецкае заканадаўства аб адказнасці за нанесеную матэрыяльную шкоду і парадак яе пакрыцця.

Як бачыце, на занятках закранаюцца важныя пытанні, адказы на якія грамадскія кантралёры павінны ведаць. На жаль, не усе члены ГНК разумеюць, наколькі сур'ёзна трэба аднесціся да вучобы. Аб гэтым сведчыць дрэннае наведванне заняткау. Напрыклад, ужо прапусцілі іх прадстаунікі філалагічнага і геаграфічнага факультэтау. Дрэнна наведваюць заняткі і члены універсітэцкай групы народнага кантролю А. Ф. Санько, І. В. Сіняуская, А. В. Алалішвілі, К. Д. Яшын і іншыя. Гэта гаворыць аб тым, што не усё яшчэ зроблена для ажыццяулення пастановы бюро ГНК БДУ аб вучобе народных кантралёрау.

Е. АКІНЧЫЦ,
намеснік старшыні ГНК універсітэта

## ЁСЦЬ МАГЧЫМАСЦІ, А АДКАЗНАСЦЬ?..

Мабыць, архітэктары і будаўнікі, ствараючы цудоуны, сучасны будынак інтэрната, што на вуліцы Кастрычніцкай, зайздросцілі яго будучым жыхарам. Каб забяспечыць нармальнае жыццё студэнтам, было прадумана усё да драбніц: чытальныя залы, пакоі адпачынку і быту, кухні, пральні, сушылкі, душы. Для буфета і сталовай адведзены выдатна абсталяваныя асобныя памяшканні. Прасторныя калідоры, холы ззялі чысцінёй. Як бачым, для таго, каб гэты інтэрнат быу самым лепшым сярод універсітэцкіх інтэрнатау, ёсць усе магчымасці.

Больш як месяц назад члены групы народнага кантролю БДУ Н. Радчанка, П. Бараноускі, А. Жылінскі наведалі гэты інтэрнат. Аб тым, што выявілі кантралёры, мы даведваемся з адпаведнага дакумента «Даведкі аб выніках праверкі інтэрната № 6 сектарам быту у перыяд з 21 па 27 кастрычніка г.г.».

Вось факты і лічбы:

— у інтэрнаце жыве 768 чалавек. З іх 698 студэнтау хімічнага і матэматычнага факультэтау, 70 выкладчыкау і аспірантау;

— калідоры, пакоі прыбіраюцца дрэнна, на лесвіцах і пляцоўках шмат акуркау;

— у студэнтау, якія дзяжураць па інтэрнату, няма спісау яго жыхароў;

— працуе толькі адзін душ. Другі бяздзейнічае (з дня уводу у эксплуатацыю будынка!). Падлога ў душы вымазана смалой і фарбамі. Рашотак (спецыяльных матау) няма ні у душавой, ні у раздзявалках. Гэта яунае парушэнне элементарных санітарна-гігіенічных норм. У шафах для адзення замест кручкоу і вешалак загнаны звычайныя цвікі;

— пад пакоі быту у інтэрнаце адведзена 7 памяшканняу. У іх ёсць па аднаму-два сталы, абабітых коудрамі. І толькі. Ніхто са студэнтаў гэтымі пакоямі не карыстаецца, яны ператвораны проста у курылкі. Як вынік гэтага — жыхары прасуюць адзенне ў сваіх пакоях, чым груба парушаюць правілы пажарнай бяспекі;

— у інтэрнаце ёсць дастатковая колькасць умывальнікау, але іх абсталяванне і санітарны стан не адпавядаюць агульным патрабаванням. Тут няма палічак для прадметау туалету, люстэрак. Многія краны выведзены са строю;

— ахвотна карыстаюцца студэнты чытальнымі заламі, пакоямі адпачынку. Аднак ні у адным з іх няма падшывак газет, літаратуры, а некаторыя пакоі загружаны мэбляй.

Народныя кантралёры пабывалі у інтэрнаце у кастрычніку. Аб выніках праверкі яны паведамілі у дэканаты матэматычнага, хімічнага факультэтау, а таксама ў адміністрацыйна-гаспадарчую частку універсітэта. Цяпер снежань. Прайшло амаль два месяцы з таго часу, але у інтэрнаце № 6 амаль нічога не зроблена па ўхіленню недахопау.

У пачатку артыкула гаварылася аб тым, што інтэрнат на Кастрычніцкай мае усе магчымасці, каб быць лепшым з лепшых. Аднак не было гаворкі пра адказнасць. Забыуся пра яе і камендант інтэрната № 6 В. П. Цурко, якому неаднаразова указвалі на недахопы, безгаспадарчасць. Ці не варта было б успомніць аб ёй дэканатам матэматычнага, хімічнага факультэтау, а таксама адміністрацыйна-гаспадарчай частцы універсітэта?

А. СВЯТЛОВА.

# ДАРОГАЙ У НАВУКУ

Яшчэ адным доктарам навук у нашым універсітэце стала больш — дысертацыю абараніў дацэнт кафедры гісторыі філасофіі і логікі Аляксандр Сямёнавіч Кляучэня. Сама па сабе гэта важная падзея нават для такога калектыву выкладчыкаў, як універсітэцкі. У гэтым невялікім артыкуле мне, аднак, хацелася б сказаць пра іншае.

Абарона Аляксандрам Сямёнавічам Кляучэнем доктарскай дысертацыі — падзея ў многім прыкметная. Яго бацька і такія, як ён, палешукі яшчэ зусім нядаўна марылі аб тым часе, калі, гаворачы словамі паэта, яны змогуць «людзьмі звацца». Сапраўды, ці мог прыдаўлены нястачамі бядняк з пінскай вёскі Дзяніскавічы Сямён Кляучэня думаць аб тым, што яго сыны, стаўшы дарослымі, будуць займацца навуковымі даследаваннямі? Самае большае, што ён мог зрабіць для Аляксандра, дык гэта ўладкаваць яго пасля заканчэння пачатковай школы пастухом. О, як ён быў рад гэтаму! Паспрабуй знайсці заробак у такой глушы — брэсцкае Палессе было самым адсталым краем у буржуазнай Польшчы.

Няцяжка сабе ўявіць, як склаўся б далейшы лёс дзяцей Кляучэні, не будзь верасня 1939 года. Тады Аляксандр зноў пайшоў у школу і вучыцца пачаў на роднай мове. Колькі планаў роілася ў галаве трынаццацігадовага юнака! Хутка яго прынялі ў камсамол. Але грымнула вайна.

...Упершыню слова «партызан» Аляксандр пачуў ад старэйшага брата, які ў трыццаць дзевятым годзе атрымаў пасаду лесніка і пасяліўся ў лесе. Летам і восенню сорак першага яго дом стаў прытулкам для тых, хто начамі глухімі дарогамі прабіраўся за лінію фронту. Тут сустракаліся і падпольшчыкі, і першыя партызаны. Аляксандр стаў памочнікам брата ў яго небяспечнай рабоце. Той спачатку прыцягваў яго да збору патронаў, гранат, пасылаў праваднікам, а потым зрабіў сувязным партызан.

У тую ноч, пад новы, сорак другі год, Аляксандр меўся быць у леснічоўцы. Але справы сувязнога затрымалі ў вёсцы. Раніцой ён пачуў страшную вестку: брата і ўсю яго сям'ю расстралялі немцы. Аляксандр Кляучэня пераходзіць у партызанскі атрад.

Школу мужнасці ён скончыў на выдатна. Аб гэтым сведчаць урадавыя ўзнагароды за ўдзел у партызанскім руху, за баі з ворагам і ў Германіі, і ў Японіі. І куды ваенны лёс ні закідаў яго, усюды ён марыў аб вучобе. Аднак толькі праз некалькі год пасля заканчэння вайны мары здзейсніліся. Восенню сорак сёмага ён сеў за парту з чатырнаццаці-пятнаццацігадовымі ў Ганцавіцкім педвучылішчы. Малодшы брат Міша, які таксама займаўся тут, не раз у роспачы разводзіў рукамі:

— Дык ты ж забыў усё нават за чацвёрты клас! Не адолееш праграму вучылішча, ды яшчэ за два гады...

А ў адказ чуў адны і тыя ж словы:

— Здолею. На фронце было цяжэй. Кляучэні крывёю заваявалі права на вучобу. Ты мне вось толькі растлумач...

І браты яшчэ ніжэй схіляліся над канспектамі. А ў верасні сорак дзевятага года студэнт трэцяга курса філалагічнага факультэта Беларускага універсітэта Міхаіл Кляучэня сустракаў брата ў Мінску. Аляксандр быў залічан на філасофскае аддзяленне без уступных экзаменаў як выдатнік вучобы.

— Нічога, я цябе яшчэ пераганю, — гаварыў ён брату.

Мяне і маіх таварышаў, якія займаліся ў адной групе з Аляксандрам Кляучэнем, зайздросна здзіўляла яго настойлівасць і працавітасць. Ды ці толькі ў гэтым ён быў прыкладам для нас, малодшых! Мы яго звалі «старым». Не, не за ўзрост. У групе былі і старэйшыя за яго студэнты. Ды аб усім не раскажаш.

Кляучэня на выдатна закончыў універсітэт. Здавалася, ну, цяпер ужо супакоіцца «стары», дасягнуў мэты. Але ён не з тых, хто супакойваецца на дасягнутым. І сапраўды абагнаў брата: раней за яго абараніў кандыдацкую дысертацыю.

І зноў настойлівая праца. Прычым у адным і тым жа напрамку. Яшчэ студэнтам ён пачаў вывучаць гісторыю польскай філасофіі, сувязі яе з развіццём грамадскай думкі на Беларусі. Дыпломную абараняў па Дэмбоўскаму, дысертацыю — па Міцкевічу, у доктарскай жа даследаваў пытанні гісторыі марксісцкай філасофіі ў Польшчы эпохі імперыялізму. Як адзначаецца ў водзыве інстытута філасофіі Варшаўскага універсітэта, Аляксандр Сямёнавіч першым узяўся за вырашэнне гэтай тэмы ў такім аб'ёме і напісаў цікавую працу. Аб важным тэарэтычным і палітычным значэнні яго вялікага даследавання падрабязна гаварылі ў час абароны дысертацыі навуковы кансультант член-карэспандэнт АН БССР, доктар філасофскіх навук І. М. Лушчыцкі, афіцыйныя апаненты прафесары з Масквы І. Я. Шчыпанаў, І. С. Нарскі, загадчык кафедры гісторыі КПСС нашага універсітэта доктар філасофскіх навук Ус. М. Сікорскі, выступіўшыя затым прафесары Ф. М. Нячай, Р. А. Левін, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута філасофіі АН БССР Э. М. Даршэвіч.

На гэтым можна было б паставіць кропку. Але хацелася б дадаць наступнае. Абарона А. С. Кляучэнем доктарскай дысертацыі — факт, у якім наогул яскрава адлюстраваўся лёс палешукоў. І яшчэ. Большасць членаў групы, у якой займаўся Аляксандр Сямёнавіч, працуе выкладчыкамі, навуковымі супрацоўнікамі, многія абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Кляучэня сярод іх — першы доктар. Карацей, з выхаванцаў гэтай групы можна было б скласці вялікую кафедру. Хіба гэта таксама не знамянальна?

**М. ІОСЬКА, дацэнт.**

*НА КАФЕДРАХ І Ў ЛАБАРАТОРЫЯХ*

# ІХ НАДЗЁННЫЯ КЛОПАТЫ

Кафедра электронных матэматычных машын існуе на фізічным факультэце сем гадоў. Спецыялізацыя студэнтаў у галіне вылічальнай тэхнікі пачалася толькі з 1964 года, а выпускнікі гэтай кафедры карыстаюцца вялікім попытам. Маладых даследчыкаў-праекціроўшчыкаў сучасных вылічальных машын з задавальненнем запрашаюць на работу ў такія ўстановы, як навукова-даследчы інстытут аўтаматычнай апаратуры, навукова-даследчы цэнтр электроннай вылічальнай тэхнікі, інстытут тэхнічнай кібернетыкі Акадэміі навук БССР і іншыя. Гэта сведчыць аб тым, што кафедра рыхтуе высокакласных спецыялістаў. Што ж спрыяе своечасоваму выяўленню талентаў, іх удасканаленню, развіццю?

Па-першае, трэба адзначыць, што, акрамя вучэбнай работы, якая знаходзіцца тут на высокім узроўні, гэтаму ў многім спрыяе даследніцкая.

Вось, напрыклад, зараз на кафедры распрацоўваецца эксперыментальная навучаючая сістэма. У гэтай рабоце актыўны ўдзел прымаюць студэнты-пяцікурснікі Валодзя Галянкоў і Аляксандр Мухарскі.

Ужо больш як два гады група студэнтаў пад кіраўніцтвам аспіранта Барыса Нямытава наладжвае вылічальнае прыстасаванне для дыягностыкі некаторых захворванняў. Працуюць рабяты ў цеснай сувязі з урачамі другой клінічнай бальніцы. Хутка гэтая складаная і адказная работа будзе завершана.

Ідзе распрацоўка вучэбнай вылічальнай машыны для навучання студэнтаў, ініцыятар якой—кандыдат тэхнічных навук Г. І. Шпакоўскі. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам працуе стажор-даследчык Віктар Рэвінскі і студэнт 5 курса Васіль Пытляк.

У працэсе работы ў лабараторыях і кабінетах удаецца выявіць здольных рабят, рыхтаваць з іх сапраўдных вучоных. Вось, напрыклад, Андрэй Каляда. Ён выпускнік нашага універсітэта. Працуе на кафедры стажорам-даследчыкам толькі год, а ўжо здаў у друк чатыры артыкулы з галіны тэорыі вылічальных машын. Яму ўдалося вырашыць дзве складаныя праблемы, якія дагэтуль здаваліся невырашальнымі, хоць за іх браліся многія даследчыкі. Адна з іх—«Выбар аптымальных асноў для непазіцыйных сістэм вылічэння». Вядома, што такія бліскучыя поспехі не прыйшлі да Андрэя за год работы на кафедры. Гэта вынік упартай працы на працягу некалькіх гадоў. Яшчэ студэнтам ён захапляўся тэорыяй у галіне арыфметыкі вылічальных машын, аддаваў гэтаму ўвесь свой вольны час. Гаворачы аб тым добрым, што ёсць на кафедры электронных матэматычных машын, нельга не ўспомніць, што гэта заслуга яе супрацоўнікаў.

Сярод іх Мікалай Мікалаевіч Пасноў, які ўзначальвае кафедру з 1963 года, старшы выкладчык Міхаіл Сцяпанавіч Лазовік, асістэнт Віталь Паўлавіч Дубкоў і таленавіты лектар, выдатны педагог Маргарыта Уладзіміраўна Мішурная. Яна кандыдат фізіка-матэматычных навук. Чытае студэнтам спецкурсы «Алгарытмічныя мовы і праграміраванне», «Шматпрацэсарныя машыны і мультыпраграміраванне». Вось ужо два гады слухачы курсаў павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў ВНУ Беларусі і Прыбалтыкі даюць самую высокую ацэнку за чытанне лекцый па вылічальнай матэматыцы і праграміраванню.

Паспяховай рабоце кафедры садзейнічае створаная на ёй вучэбная лабараторыя з навейшым выдатным абсталяваннем. Шмат робіць і навукова-даследчая група па распрацоўцы эксперыментальнай навучаючай сістэмы. У будучым годзе яна будзе рэарганізавана ў магутную праблемную лабараторыю, вынікамі работы якой будзе карыстацца не толькі наш універсітэт, але і многія іншыя ВНУ Саюза.

**А. СЁМІНА.**

# ЯКОЙ БЫЦЬ АГІТБРЫГАДЗЕ?

У мінулым годзе ў адным з нумароў факультэцкай газеты «За навуку» была змешчана анкета «Хто мы?» У ёй можна было знайсці такую звестку: «Кожны другі студэнт фізфака вучыўся музыцы», а супраць слоў «колькасць агітбрыгад» стаяў адзінокі нуль.

Атрымаўшы такі даволі сумны вынік, члены камітэта камсамола факультэта прыняліся энергічна вышукваць хоць маленькую частку з той тысячнай палавіны, якая магла б увайсці ў састаў першых агітбрыгад. І трэба сказаць, што ўжо ў снежні мінулага года адбыліся першыя выезды ў падшэфныя вясковыя школы. А на зімовых канікулах агітбрыгадаўцы зрабілі нават лыжны паход. Як і належыць, у канцы навучальнага года камітэт правёў агляд-конкурс агітбрыгад, выявіў лепшых. Але нагадваў гэты конкурс звычайны агляд студэнцкай мастацкай самадзейнасці.

Відаць, ствараючы агітбрыгады, камсамольцы не ўлічылі галоўнага іх прызначэння, не ўдумаліся ў сутнасць слова «агітбрыгада» — г. зн. брыгада, якая «ўздзейнічае на масы шляхам распаўсюджання пэўных ідэй і лозунгаў». Іменна такімі і былі агітбрыгады, узнікшыя ў першыя гады будаўніцтва новага грамадства, брыгады, арганізаваныя ў час Вялікай Айчыннай вайны. Народжаныя камсамольскім энтузіязмам, яны і цяпер (як, напрыклад, агітбрыгада магілёўскіх рабочых «Усмешка») з'яўляюцца «магутнай зброяй палітычнага выхавання».

А давайце паглядзім, што вязуць у вёску нашы агітбрыгады. Звычайна гэта скарочаны да мінімуму варыянт лекцыі аб універсітэце або на якую-небудзь іншую тэму, якая служыць своеасаблівай тытульнай вывескай, і канцэрт, праграму якога складаюць у асноўным турысцкія песні пад гітару, верш, адна-дзве сцэнкі са студэнцкага жыцця. Нярэдка гэтыя праграмы складаюцца па прынцыпу «у каго што ёсць».

Я не хачу сказаць, што такія выезды зусім не патрэбны. Проста і над іх праграмай трэба больш думаць. І не абавязкова праводзіць іх пад вывескай агітбрыгады.

Вядома, гледачы далёкіх вёсак рады і такім візітам студэнтаў, рады магчымасці пагутарыць з імі, паслухаць іх песні. Але не трэба здзіўляцца халаднаватаму прыёму ў больш блізкіх да горада вёсках, дзе гледачам не ў навінку канцэрты прафесіяналаў, дзе іншы раз у адказ на замінку або нецікавы нумар раздаецца свіст.

Нядаўна на бюро камітэта камсамола фізфака заслухалі справаздачу адказнага за культмасавы сектар патока Віктара Багнюка. Хлопец, паціскаючы плячыма, гаварыў: «Ну, стварылі на патоку агітбрыгаду. А што яшчэ можна зрабіць?»

У юнака быў такі шчыры погляд, столькі ўпэўненасці ў сваёй невінаватасці, што, напэўна, усе міжволі спыталі ў сябе: «А што, хіба можна зрабіць яшчэ што-небудзь за год культмасаваму сектару патока?»

Аднак калі б адказны часцей бываў на рэпетыцыях свайго «дзецішча», дапамог скласці праграму, цікава аформіць яе, можна было б гаварыць з ім і аб іншых формах культмасавай работы. А так даводзіцца толькі здзіўляцца пасіўнасці такіх камсамольцаў і шкадаваць: «Няўжо канулі ў Лету камсамольскі задор і студэнцкая выдумка?..»

Пэўнага адказу на гэтае пытанне не даў і прайшоўшы на днях новы конкурс агітбрыгад. Зноў атрымаўся агляд мастацкай самадзейнасці, хоць і на крыху вышэйшым узроўні, чым у мінулым годзе.

Я запытала ў старшыні журы Леаніда Шэхтмана, студэнта III курса, ці адпавядаюць цяперашнія агітбрыгады фізфака свайму назначэнню?

— Па-мойму, не адпавядаюць,—сказаў ён, — але паездкі даюць нам магчымасць палепшыць выканаўчае майстэрства.

А вось як адказала на гэтае пытанне член камітэта камсамола, адказная за культмасавы сектар Таццяна Фёдарава:

— Пасля агляду асабліва адчуваецца, наколькі далёкія яны ад сапраўдных агітбрыгад.

Я ўяўляю сабе агітбрыгаду, праграма якой прасякнута адной мэтай, магчыма, нават інсцэніраваная. Відавочна, што камітэту камсамола трэба дапамагчы агітбрыгадам поўнасцю перагледзець іх праграмы.

Карысную і цікавую справу задумалі камсамольцы, і аб тым, як зрабіць нашы студэнцкія агітбрыгады дастойнымі прадаўжальнікамі лепшых традыцый, трэба падумаць не толькі камітэту камсамола фізфака, але і камітэтам камсамола іншых факультэтаў.

**Н. САЛУК.**





*Знайсці элементы падробкі дакументаў — гэта толькі адна са шматлікіх задач, якія павінны вырашыць студэнты-юрысты IV курса разам са сваім выкладчыкам Ю. І. Рэутавым на практычных занятках па крыміналістыцы.*

Фота **Д. Чаховіча.**

